# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 20 (842) | Аўторак, 15 снежня 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 кап.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У апошняй дэкадзе лістапада адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Першым па парадку дня па дакладу начальніка навукова-даследчага сектара Г. С. Міцюрыча была заслухана і абмеркавана справаздача аб выніках выканання ў 1992 г. навуковых заданняў Дзяржаўнай праграмы ліквідацыі ў Рэспубліцы Беларусь вынікаў аварыі на ЧАЭС і работ, фінансуемых за кошт бюджэту.

Даклад дэкана эканамічнага факультэта Т. В. Карпей быў прысвечаны пытанню эканамічнай падрыхтоўкі студэнтаў вытворчых спецыяльнасцей. Як вядома, да апошняга часу яны вывучалі курс асноў эканамічных тэорый. Прынята прапанова аб працягу эканамічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў вытворчых спецыяльнасцей фізічнага, матэматычнага і геалагічнага факультэтаў выпускаючымі кафедрамі на IV і V курсах. У якасці вучэбна-эканамічнай дысцыпліны рэкамендавана ўвесці курс «Асновы прадпрымальніцтва і фінансавы рынак» у аб'ёме 54 гадзін з абавязковай здачай экзамена.

На вучоным савеце зацверджаны Патрабаванні да прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ, палажэнне і метадычныя рэкамендацыі аб стварэнні і арганізацыі дзейнасці часовых творчых калектываў па атрыманню і перадачы навукова-тэхнічнай прадукцыі у навуковых структурах — падраздзяленнях універсітэта на аснове дагавору, падрада.

Вучоны савет прысвоіў групе выпускнікоў аспірантуры кваліфікацыю «Даследчык», дазволіў найбольш падрыхтаваным кандыдатам навук кіраўніцтва падрыхтоўкай аспірантаў, разгледзеў некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## Пераможцы рэспубліканскага конкурсу

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Прэзідыум Беларускага праўлення саюза навуковых і інжынерных таварыстваў падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу 1991/92 навучальнага года на лепшую навуковую работу студэнтаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках.

У прынятай пастанове адзначаны восем ВНУ рэспублікі, якія дасягнулі лепшых паказчыкаў у конкурсе. Трэцім у гэтым спісе пасля Мінскага радыётэхнічнага і Наваполацкага політэхнічнага інстытутаў значыцца наш універсітэт. Указана, што яго студэнты з году ў год на рэспубліканскіх конкурсах дасягаюць усё больш высокіх якасных вынікаў. За дасягнутыя поспехі разам з іншымі сямю ВНУ Беларусі, якія дабіліся лепшых паказчыкаў у конкурсе, ГДУ ўзнагароджаны граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Сярод лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу навуковых работ па раздзелу «Фізічныя навукі» выпускнікі Сяргей Хахомаў з фізічнага факультэта і па раздзелу «Матэматычныя навукі» — Таццяна Еўдакімава (матфак). Яны ўдастоены Дыпломаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і грашовых прэмій.

Дыпломам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па раздзелу «Матэматычныя навукі» адзначана навуковая праца ўжо скончыўшай ГДУ Алены Ражалоўскай (матфак), па раздзелу «Гістарычныя навукі» — таксама выпускніцы гісторыка-юрыдычнага факультэта Вольгі Хатылёвай.

Дыпломамі Беларускага рэспубліканскага савета па НДРС адзначаны навуковыя працы Ірыны Харонжай (матэматычны факультэт) па раздзелу «Матэматычныя навукі», Уладзіміра Клінцова і Валянціны Рабікавай (эканамічны факультэт) па раздзелу «Агульная эканоміка» (усе закончылі ГДУ).

За вялікую работу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і забеспячэнню якаснага кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі даследаваннямі вялікая група вучоных рэспублікі ўзнагароджана граматамі Міністэрства адукацыі. Сярод іх — дэкан фізічнага факультэта І. В. Семчанка і загадчык кафедры алгебры і геаметрыі В. С. Манахаў з нашага універсітэта, а таксама ўжо ўшоўшы з жыцця дацэнт гісторыка-юрыдычнага факультэта У. У. Багамольнікаў.

На жаль, не абышлося без прыкрага факта. У загадзе-пастанове па Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь, прэзідыума Беларускага праўлення саюза навуковых і інжынерных таварыстваў загадчыку кафедры гісторыка-юрыдычнага факультэта нашага універсітэта дацэнту Р. Р. Лазько ўказана як старшыні конкурснай камісіі на несвоечасовае прадстаўленне выніковай справаздачы.

## ВЯЛІКАМУ МАТЭМАТЫКУ

У пачатку снежня ў Беларускім дзяржуніверсітэце адбылася міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага матэматыка Мікалая Іванавіча Лабачэўскага.

Уступным словам яе адкрыў патрыярх беларускай навукі, Герой Сацыялістычнай Працы, фізік-тэарэтык, акадэмік Ф. І. Фёдараў. На першым пленарным пасяджэнні былі заслуханы шматлікія даклады, у якіх асвятлялася навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць М. І. Лабачэўскага не толькі ў галіне матэматыкі, але і ў іншых галінах навукі.

У ліку дакладчыкаў на секцыйных пасяджэннях канферэнцыі былі 9 выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедр матэматычнага факультэта нашага універсітэта.

Канферэнцыя прайшла на высокім узроўні, дзякуючы аргкамітэту на чале з вядомым у нашай рэспубліцы геаметрам, загадчыкам кафедры геаметрыі і тапалогіі БДУ прафесарам А. С. Фядэнкам.

**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**удзельнік канферэнцыі.**

## ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

24-га лістапада адбылася прафсаюзная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Яе дэлегаты заслухалі і абмеркавалі справаздачу прафсаюзнага камітэта, з дакладам па якой выступіў яго старшыня **Г. І. Варатніцкі**, і справаздачу рэвізійнай камісіі (дакладчык — старшыня рэўкамісіі **І. К. Кекіш**).

Пры абмеркаванні справаздач выступілі дырэктар спартклуба **Д. М. Жаркоў**, асістэнт кафедры эканомікі і сацыялогіі працы **Э. І. Лізарава**, старшыні прафбюро: геолага-геаграфічнага факультэта — **А. С. Кузьміцкая**, матфака — **В. Л. Мярэжа**, дацэнт фізічнага факультэта **У. С. Стрыжнеў**, прафесар **У. В. Анічэнка**, тэхнічны інспектар галіновага абкома прафсаюза **В. І. Крушанаў**, рэктар універсітэта член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі **Л. А. Шамяткоў**.

Выступленні ўсіх прамоўцаў былі пранікнуты заклапочанасцю аб далейшым паляпшэнні праводзімай работы, забеспячэнні для яе належных умоў, умацаванні парадку і дысцыпліны, прыняцці неабходных мер для выжывання ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах.

У прынятай па заслуханых справаздачах пастанове работа прафкома прызнана здавальняючай. Дэлегатамі канферэнцыі да ведама прынята справаздача рэўкамісіі, у якой адзначана, што парушэнняў фінансавай дысцыпліны ў дзейнасці прафкома не наглядалася, усе сродкі расходваліся ў адпаведнасці з зацверджаным каштарысам.

Выбраны новыя саставы прафсаюзнага камітэта і рэвізійнай камісіі адпаведна ў складзе 23 і 3 чалавек. Старшынёй прафкома на новы тэрмін аднагалосна зноў выбраны **Г. І. Варатніцкі**.

Увазе чытачоў прапануецца ў пераказе справаздача прафкома, якая апублікавана на другой старонцы сённяшняга нумара нашай газеты.

## З ВУЧОНЫМІ ЗВАННЯМІ!

Міністэрства адукацыі Расійскай Федэрацыі разгледзела прадстаўленыя дакументы і прысвоіла вучонае званне: прафесара — кандыдату педагагічных навук, загадчыку кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры **СЕМІКОПУ Арнольду Фёдаравічу**; дацэнта — кандыдатам фізіка-матэматычных навук **ПЕНЯЗЮ Уладзіміру Аляксандравічу** з кафедры оптыкі, **ЛУБАЧКІНУ Аляксандру Васільевічу** і **КАМОРНІКАВУ Сяргею Фёдаравічу** з кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання, кандыдатам эканамічных навук **БАГДАНАВУ Міхаілу Іванавічу** з кафедры інфарматыкі і АСК, **ПАНОВАЙ Таццяне Ігараўне** з кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці, **КАРЖОВУ Васілю Сяргеевічу** з кафедры эканомікі і сацыялогіі працы. З гэтай нагоды іх горача віншуюць рэктарат, калегі па працы, студэнты універсітэта і жадаюць ім далейшых поспехаў у педагагічнай і навуковай дзейнасці.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры оптыкі ФЯДОСЕНКУ Мікалая Мікалаевіча з выпадку паспяховай абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.**

* * *

**Рэктарат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай літаратуры ШЫНКАРЭНКА Вольгу Карпаўну з атрыманнем дыплома кандыдата філалагічных навук.**

* * *

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай мовы БОБРЫКА Уладзіміра Андрэевіча (навуковы кіраўнік — прафесар У. В. Анічэнка) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

## АДДЗЕЛ МІЖНАРОДНЫХ СУВЯЗЕЙ

Па рашэнню вучонага савета з 1 лістапада г. г. у нашым універсітэце ліквідаваны дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі і створаны аддзел па міжнародных сувязях. Яго загадчыкам назначаны дацэнт кафедры гісторыі Беларусі У. А. Сізоненка, У штаце новага аддзела таксама спецыяліст па міжнародных сувязях Т. В. Яроміна, старшы інспектар В. І. Андрэйкава, інспектар Н. М. Апет. У функцыі названага аддзела ўваходзіць каардынацыя навуковых сувязей выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ з іх замежнымі калегамі, падбор кандыдатур для працягу вучобы і навуковых стажыровак ў іншых краінах, арганізацыя вучэбнага працэсу замежных студэнтаў, якія набываюць адукацыю ў нашым універсітэце.

## ХРОНІКА

Загадам па універсітэту ад 23 лістапада г.г. скасавана пасада прарэктара па завочнаму навучанню і ў сувязі з павелічэннем нагрузкі ўведзена яшчэ адна пасада прарэктара па вучэбнай рабоце. На новую пасаду назначаны кандыдат філалагічных навук **ВОІНАЎ Мікалай Мікалаевіч**, які раней быў прарэктарам па завочнаму навучанню.

# ПАТРАБАВАННІ

## ДА ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА САСТАВУ Ў ГОМЕЛЬСКІМ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Пры добрасумленным выкананні сваіх службовых абавязкаў да прафесарска-выкладчыцкага саставу Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:

### I.

### ДА ДЭКАНА ФАКУЛЬТЭТА

1.1. Мець вучонае званне прафесара або дацэнта.
1.2. Непасрэдна кіраваць вучэбна-навуковай і выхаваўчай работай на факультэце, аказваць садзеянне рабоце ў інтэрнатах.
1.3. Праводзіць у жыццё вучэбныя планы.
1.4. Ажыццяўляць кантроль за арганізацыяй вучэбнага працэсу на факультэце.
1.5. Складаць расклад вучэбных заняткаў і ажыццяўляць кантроль за яго выкананнем.
1.6. Ажыццяўляць кантроль за самастойнай работай студэнтаў, за правядзеннем экзаменаў і залікаў.
1.7. Пераводзіць студэнтаў з курса на курс, дапускаць да здачы курсавых і дзяржаўных экзаменаў, абароны дыпломнай работы (праекта).
1.8. Кіраваць назначэннем стыпендыі студэнтам факультэта ў адпаведнасці з існуючым палажэннем.
1.9. Ажыццяўляць кантроль за павышэннем кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу.
1.10. Ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па прадметах кафедр, якія ўваходзяць у склад факультэта.
1.11. Арганізоўваць і праводзіць пасяджэнні вучонага савета факультэта, дэканата, міжкафедральныя нарады, навуковыя і навукова-метадычныя нарады і канферэнцыі.
1.12. Ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва навуковай работай студэнтаў, якая праводзіцца на кафедрах.
1.13. Арганізоўваць сувязь з выпускнікамі факультэта, вывучаць якасць іх практычнай работы і распрацоўваць мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якіх выпускае факультэт.
1.14. Займацца пытаннямі прафарыентацыі, набору і працаўладкавання выпускнікоў.
1.15. Арганізоўваць атэстацыю загадчыкаў лабараторый і ст. лабарантаў.
1.16. Ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва куратарамі.

### II.

### ДА ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ

2.1. Мець вучоную ступень доктара навук або вучонае званне прафесара. У парадку выключэння — вучоную ступень кандыдата навук, вучонае званне дацэнта.
2.2. Сістэматычна публікаваць як навуковыя, так і вучэбна-метадычныя работы (артыкулы ў часопісах, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя і метадычныя дапаможнікі).
2.3. Пастаянна ўдасканальваць лектарскае майстэрства, ажыццяўляць чытанне лекцый на высокім навуковым і метадычным узроўні, укараняць перадавыя метады навучання (праблемнае навучанне, метад актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і інш.), перадаваць свой вопыт членам кафедры.
2.4. Забяспечваць арганізацыю і ажыццяўляць кантроль за выкананнем праграм, чытаннем лекцый, правядзеннем лабараторных, практычных, семінарскіх і іншых відаў заняткаў, прадугледжаных вучэбным планам, на высокім тэарэтычным і навукова-метадычным узроўні.
2.5. Кіраваць арганізацыяй і ажыццяўляць кантроль за праходжаннем практыкі студэнтамі, выкананнем курсавых і дыпломных работ.
2.6. Арганізоўваць і ажыццяўляць кантроль за павышэннем кваліфікацыі членаў кафедры.
2.7. Праводзіць мерапрыемствы па арганізацыі выхаваўчай работы сярод студэнтаў, кантраляваць работу куратараў.
2.8. Распрацоўваць і прадстаўляць на зацвярджэнне вучэбны план спецыялізацыі (для выпускаючых кафедр).
2.9. Кіраваць падрыхтоўкай падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і іншай вучэбна-метадычнай літаратуры.
2.10. Кіраваць навукова-даследчай работай членаў кафедры і студэнтаў, укараненнем вынікаў гэтых прац у народную гаспадарку.
2.11. Кіраваць складаннем індывідуальных планаў членаў кафедры і кантраляваць іх выкананне.
2.12. Вывучаць, абагульняць і распаўсюджваць вопыт работы лепшых выкладчыкаў.
2.13. Арганізоўваць аказанне дапамогі пачынаючым выкладчыкам у авалоданні педагагічным майстэрствам.
2.14. Кіраваць распрацоўкай і ажыццяўленнем мерапрыемстваў па выкарыстанню тэхнічных сродкаў навучання ў вучэбным працэсе.
2.15. Кіраваць планавай падрыхтоўкай навукова педагагічных кадраў, складаць перспектыўны план развіцця кафедры.
2.16. Разглядаць на пасяджэннях кафедр дысертацыі членаў кафедры або (па даручэнню рэктарата) іншых саіскальнікаў, а таксама манаграфіі, навуковыя і метадычныя артыкулы і г. д.
2.17. Кіраваць устанаўленнем сувязей з прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі і іншымі ВНУ з мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, абагульнення і распаўсюджання перадавога вопыту і аказання навукова-тэхнічнай дапамогі.
2.18. Арганізоўваць сістэматычную сувязь са скончыўшымі універсітэт і аспірантамі-выпускнікамі дадзенай кафедры.
2.19. Несці персанальную адказнасць за працоўную і выканаўчую дысцыпліну членаў кафедры, іх маральнае і маральна-эстэтычнае выхаванне, выдачу аб'ектыўных характарыстык.
2.20. Прадстаўляць да атэстацыі лабаранцкі састаў кафедры.
2.21. Займацца пытаннямі прафарыентацыі, набору і працаўладкавання выпускнікоў.
2.22. Кіраваць работай куратараў.

### III.

### ДА ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ*

3.1. Мець вучоную ступень доктара навук або, як выключэнне, вучоную ступень кандыдата навук.
3.2. Сістэматычна публікаваць як навуковыя, так і вучэбна-метадычныя работы (міжнародныя публікацыі, артыкулы ў часопісах, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі). Для асоб, не маючых вучонай ступені доктара навук за апошнія пяць гадоў, мець не менш двух падручнікаў або вучэбных дапаможнікаў (без сааўтараў) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дысцыплінах, замацаваных за дадзенай кафедрай.
3.3. Для асоб з вучонай ступенню доктара навук для выбрання мець не менш 10 гадоў стажу навукова-педагагічнай работы, з іх не менш пяці гадоў — педагагічнай работы ў ВНУ.
3.4. Для асоб, не маючых вучонай ступені доктара навук, для выбрання мець не менш 15 гадоў стажу навукова-педагагічнай работы, у тым ліку не менш 10 гадоў стажу педагагічнай работы ў ВНУ.
3.4.1. Павышаць сваю навуковую кваліфікацыю, працаваць над доктарскай дысертацыяй.
3.5. Паказваць і пастаянна ўдасканальваць лектарскае майстэрства, ажыццяўляць чытанне лекцый на высокім навуковым і метадычным узроўні, укараняць перадавыя метады навучання (метад актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, праблемнае навучанне і г. д.).
Чытаць лекцыі па асноўных курсах кафедры.
3.6. Ажыццяўляць кіраўніцтва вучэбна-метадычнай работай асістэнтаў, ст. выкладчыкаў, дацэнтаў.
3.7. Кіраваць напісаннем дыпломных і курсавых работ.
3.8. Адыгрываць вядучую ролю ў арганізацыі студэнцкай навуковай работы ў розных яе формах.
3.9. Быць кіраўніком навуковага, метадалагічнага семінара.
3.10. Непасрэдна ўдзельнічаць у навукова-даследчай рабоце кафедры і кіраваць па ўзначальваемай ім тэме навуковай работай сумесна працуючых членаў кафедры.
3.11. Ажыццяўляць навуковае кіраўніцтва аспірантамі.
3.12. Рэцэнзаваць дысертацыі, навуковыя і вучэбна-метадычныя працы супрацоўнікаў універсітэта і іншых ВНУ, а таксама дыпломныя работы студэнтаў.
3.13. Удзельнічаць у рабоце спецыялізаваных вучоных саветаў па абароне дысертацый, выступаць у якасці афіцыйнага апанента на абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.
3.14. Займацца пытаннямі прафарыентацыі, набору і працаўладкавання выпускнікоў.

### IV.

### ДА ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ

4.1. Мець вучоную ступень кандыдата або доктара навук або, як выключэнне, не мець вучонай ступені.
4.2. Сістэматычна публікаваць як навуковыя, так і вучэбна-метадычныя работы (артыкулы ў часопісах, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі). Для асоб, не маючых вучонай ступені кандыдата навук, за апошнія пяць гадоў мець не менш аднаго падручніка або вучэбнага дапаможніка з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па курсах, замацаваных за дадзенай кафедрай (без сааўтараў).
4.3. Для выбрання мець не менш 5 гадоў стажу навукова-педагагічнай работы, у тым ліку не менш 3 гадоў стажу педагагічнай працы ў ВНУ. Для асоб, не маючых вучонай ступені кандыдата навук, мець 15 гадоў стажу навукова-педагагічнай работы, у тым ліку не менш 10 гадоў педагагічнай працы ў ВНУ.
4.4. Павышаць сваю навуковую і педагагічную кваліфікацыю, працаваць над кандыдацкай або доктарскай дысертацыяй.
4.5. Пастаянна ўдасканальваць лектарскае майстэрства, ажыццяўляць чытанне лекцый на высокім навуковым і метадычным узроўні, укараняць перадавыя метады навучання (праблемнае навучанне, метад актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і інш.).
4.6. Ажыццяўляць кіраўніцтва вучэбна-метадычнай работай асістэнтаў і выкладчыкаў.
4.7. Кіраваць напісаннем дыпломных і курсавых работ.
4.8. Актыўна ўдзельнічаць ў арганізацыі студэнцкай навуковай работы ў розных яе формах.
4.9. Непасрэдна ўдзельнічаць у навукова-даследчай рабоце кафедры, выконваць адзін з раздзелаў тэмы навукова-даследчай работы кафедры.
4.10. Рэцэнзаваць навуковыя і вучэбна-метадычныя работы, дыпломныя работы.
4.11. Выступаць у якасці афіцыйнага апанента на абароне кандыдацкіх дысертацый.
4.12. Займацца пытаннямі прафарыентацыі, набору і працаўладкавання выпускнікоў.

### V.

### ДА СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ

5.1. Мець вучоную ступень кандыдата навук або, як выключэнне, не мець вучонай ступені.
5.2. Для асоб, не маючых вучонай ступені, мець не менш 5 гадоў стажу навукова-педагагічнай работы, у тым ліку не менш пяці гадоў стажу педагагічнай працы ў ВНУ.
5.3. Сістэматычна публікаваць як навуковыя, так і вучэбна-метадычныя працы (артыкулы ў часопісах, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі).
5.4. Павышаць сваю навуковую і педагагічную кваліфікацыю, працаваць над кандыдацкай або доктарскай дысертацыяй.
5.5. Пастаянна ўдасканальваць сваё лектарскае майстэрства, ажыццяўляць чытанне лекцый на высокім навуковым і метадычным узроўні, укараняць перадавыя метады навучання (праблемнае навучанне, метад актывізацыі пазнавальнай дзейнасці і інш.).
5.6. Ажыццяўляць кіраўніцтва вучэбна-метадычнай работай асістэнтаў і выкладчыкаў.
5.7. Кіраваць напісаннем курсавых і дыпломных работ.
5.8. Актыўна ўдзельнічаць у арганізацыі студэнцкай навуковай работы ў розных яе формах.
5.9. Непасрэдна ўдзельнічаць у навукова-даследчай рабоце кафедры, выконваць адзін з раздзелаў тэмы навукова-даследчай работы кафедры.
5.10. Рэцэнзаваць навуковыя, вучэбна-метадычныя і дыпломныя работы.

### VI.

### ДА АСІСТЭНТА І ВЫКЛАДЧЫКА

6.1. Валодаць дастатковай кваліфікацыяй для педагагічнай і навукова-даследчай работы.
6.2. Пад кіраўніцтвам прафесара, дацэнта або ст. выкладчыка праводзіць на высокім метадычным узроўні практычныя, семінарскія, лабараторныя заняткі.
6.3. Весці ўлік бягучай паспяховасці студэнтаў.
6.4. Кіраваць напісаннем курсавых работ.
6.5. Сістэматычна публікаваць навуковыя і вучэбна-метадычныя работы.
6.6. Павышаць сваю навукова-педагагічную кваліфікацыю шляхам здачы кандыдацкіх экзаменаў, навучання ў завочнай аспірантуры або шляхам саіскальніцтва (для асістэнтаў і выкладчыкаў без вучонай ступені).
6.7. Ажыццяўляць чытанне лекцыйных курсаў і кіраваць дыпломнымі работамі па рашэнню савета факультэта.
6.8. Удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце па тэмплану універсітэта.

### VII.

7. Усе пытанні, звязаныя з выбраннем, прадстаўленнем да вучоных і ганаровых званняў, а таксама іншыя конкурсныя справы загадзя разглядаюцца на экспертнай камісіі вучонага савета універсітэта.

**ЗАЦВЕРДЖАНА ВУЧОНЫМ САВЕТАМ УНІВЕРСІТЭТА 24 ЛІСТАПАДА 1992 г.**

---

* Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да саіскальнікаў вучонага звання прафесара і з'яўляюцца буйнымі спецыялістамі народнай гаспадаркі, культуры, мастацтва, а таксама асобамі, якія займаюць пасады рэктара, прарэктараў універсітэта, разглядаюцца вучоным саветам універсітэта ў кожным канкрэтным выпадку.

